Яўген Маліноўскі

ПАРУСІЯ: ПСІХАЛОГІЯ ПРЫСУТНАСЦІ

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ББК 86
Мал 18

Маліноўскі Яўген
Парусія: псіхалогія прысутнасці. — Баранавічы : Грамадскае аб'яднанне "Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны", 2007. — 260 с., іл.

ББК 86

© Грамадскае аб'яднанне
"Таварыства беларускай мовы
імя Францішка Скарыны" 2007
© Афармленне Уладзімір Гундар

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ПАРУСІЯ АДКАЗНАСЦІ

Вера, якая не пераходзіць у культуру
не мае плёну.

Ян Павал II

II

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

II.4. Вербная парусія

Итересную рубрику предложил нам, читателям «Інтекса», отец Евгений, но почему на белорусском языке, ведь «в царстве небесном»не будет национальностей, так, кажется, говорит Евангелие? К тому же русское слова «парус» такое символичное нам, представителям «шестидесятых», «семидесятых», воспитанных на стихах Лермонотова «белеет парус одинокий»и на «Алых парусах» А. Грина; тем не менее от «парусии» веет подкупающим романтизмом...

Валерий Михайлов

Не такое яно і рускае, гэтае слова "парус". Хутчэй за ўсё, яно грэцкага паходжання і сугучнае эвангельскаму сэнсу Другога прыйсця Гасподняга як прысутнасці, асабістага збавення кожнага, хто побач з Ім (par usia - побач з існым). Але мушу пагадзіцца з Валерыем аб рамантычным сэнсе ветразя менавіта як «паруса». Гэтая справа вяшчае ў сабе "ветразь вандраванняў" як матыў Царства Нябеснага, усё ж такі непадзельнага з нацыянальным вызначэннем: "І будзе ў апошнія дні гара дома Гасподняга і ўзвысіцца, і пацякуць да яе ўсе народы" [Іс 2, 2]. Гэта значыць, што кожны народ мусіць уславіць Бога ў свой асабісты спосаб, на сваёй роднай мове ў "згуртаванні плямён" [Іс 43, 9], на падабенства "Арганізацыі Аб'яднаных Нацый".

Але што азначае новазапаветны, узгаданы нашым чытачом, вобраз Стваральніка сусвету "Дзе няма ні Эліна, ні Юдэя, ні абрэзання, ні неабрэзання, варвара, Скіфа, вольніка, а ўсё і ва всім Хрыстос" [Кал 3, 11], як не тое, што "Ўсе народы збяруцца дзеля імя Госпада ў Ерусаліме і не будуць болей рабіць у упартасці сэрца свайго" [Ер 3, 17]. Ні адзін народ ужо не будзе панаваць над іншым як "старший брат" альбо гаварыцца як «самый мудрый народ» – ці то "жыд", ці то "лях", ці маскаль", ці хахол" – але для сваёй адпаведнай вольніцы удасканаліць нацыянальную мову праз унікальны спосаб удзячнасці Богу. Таму беларус, які прагне сваёй свабоды, мусіць праславіць Бога ў сваім ш-часці як часткі сусвету Божага, "Мноства якога ніхто ня мог палічыць, з усіх плямёнаў, і каленаў, і народаў, і родаў, што ста-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ялі перад тронам Агнца ў белых шатах з пальмавымі галінкамі ў руках сваіх" [Адкр 7, 9].

У Царстве Божым будуць нацыі і будзе пол, але ні тое, ні другое ужо не будзе панаваць над асобаю чалавека як вобразам і падабенствам Божым, гэта значыць, ня будзе асобы беларуса ці мужчыны і жанчыны, але будзе асоба Валерыя, не страціўшага сваю мужчынскую ды нацыянальную годнасць, адказную за свой род як беларускі на-род. Народ паходзіць з мужнай рашучасці асобы, духоўна выкшталтаванай нацыянальна прывабным станам нявесты: "І Дух і нявеста кажуць: прыйдзі! Спрагнены хай прыходзіць, і, хто жадае, няхай бярэ жыцця задарма "[Адкр 22, 17]. Айцец Нябесны і Маці Царква бескарысліва адукоўваюць сваіх дзяцей у нацыянальнай традыцыі, адпаведнай гісторыі і культуры краіны. Таму народ шануе тую мову, якой яго любіць Маці Царква. Народ — гэта супольнасць святых, памнажаючых сваю колькасць праз моўнае характэр Духа. Таму тая супольнасць, якая адкідае ад сябе гэты асаблівы Дух Слова, не можа лічыць сябе народам, але з цягам часу дэградуе да у-роду, што значыць роду у-бываючаму, выміраючаму, зыходзячаму з арэны Ізраіля як народа Божага. Хрыстос нарадзіўся ў Бэтлееме, каб усякае племя, што выходзіць з вертэпу «жывёліны бязмоўнай», набывала ўжо сваю моўную сялібу.

Зараз беларусы перажываюць крызіс ідэнтыфікацыі, зразумелы праз калаж моўных гульняў, рабуючых маладога чалавека, немагчыма зафіксаваць саматоеснасць сваёй лінгвістычнай асобы. На навукова-практычнай канферэнцыі ў Мінску адзін навуковец дзяліўся сваёй "тэхналогіяй" фармавання лінгвістычнай асобы маладога чалавека ў варунках двухмоўя. Я вымушаны быў яму заўважыць, што асоба беларуса канстытуецца там і тады, дзе і калі робіцца выбар у бок лінгвістычнай меншасці, без гэтага выбару асоба не можа адбыцца, як не можа дагадзіць Богу чалавек з падвойнымі думкамі ў стане "дыяфоры", гэта значыць "цеплахалоднасці": "Як што ты цёплы, а не гарачы і не халодны, дык выплюну цябе з вуснаў маіх" [Адкр 3, 17]. Як гэта нам, выгнанцам з вуснаў Божых, ды не павярнуцца да маўклівай пакоры прывучанай бездапаможнасці? А можа, гэта лёс такі беларуса, а можа, "так і трэба" яму жыць у вечным уціску —

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

лёсу, абставін, начальства, жонкі, іншаземнай мовы? Калі так, дык Хрыстос дарэмна нарадзіўся і ўваскрос з памерлых.

Стратэгія сучаснага беларуса забяспечана адмовай ад устаноўкі на смерць. Таму ён вядзе дыялог з самім сабой, выбіраючы з дзвюх моваў адну галоўную, на якой ён прамаўляе Святое Пісанне; другая мова можа заставацца рабочай, міжнацыянальнай, але жыццёвы выбар зроблен — заставак набыў нацыянальны характар, а характар — гэта пячатка на лбе тых самых многіх народаў з пальмавымі ці вербнымі галінкамі, "Якія прыйшлі ад вялікае скрухі, але адбялілі сваю вопратку крывёю Агнца" [Адкр 7, 14]. Вербная галінка — сымбаль Беларусі, якой, сапраўды, не патрэбна перайманне ружовай ці памаранчавай рэвалюцыі, бо ўсякае перайманне збочана палітычным аўтарытэтам. "Побач з Існым" пераймае парусіі, што "Абвяшчаць суд народам; не запярэчыць, ні залямантуе, і не пачуе ніхто на вуліцах голасу Ягонага, пакуль не давядзе суд да перамогі" [Мц 12, 20].

Асоба беларуса вызначаецца праз "вербную" альбо вербальную, г.зн. моўную (verbum*) рэвалюцыю, якая перамяняе стан беларуса ад бязмоўя да духоўнага дыялогу паводле Слова, адзіна маючага паўнамоцтвы судзіць і перамагаць: "Хто не са Мной, той супраць Мяне, і хто не збірае са Мной, той раскідае" [Мц 12, 30]. Усякая рэвалюцыя — справа маладых. Зялёныя галінкі вербай парусіі не могуць пакінуць абыякавымі нас, прадстаўнікоў 60-х, 70-х. І мы разам з імі мужнеем і квітнеем у маладыйнай сугучнасці Слова, далучаючыся да юнацтва XXI стагодзя дзяцей Божых.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ